З-пад пяра

➤ "Мы кнігу жыцця пішам самі..." — так назвалі свой новы калектыўны зборнік паэзіі і прозы члены літаратурнага аб'яднання Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання. У кнізе змешчаны творы дваццаці аднаго паэта, празаіка і публіцыста. Большасць з іх — выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты, якія з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі ўніверсітэцкага літаратурнага аб'яднання "Чароўныя гукі". Заключны раздзел кнігі мае назву "Нашы госці" і змяшчае вершы паэтаў, якія сябруюць з літаратурнай суполкай універсітэта. На прэзентацыі ва ўніверсітэцкай бібліятэцы перад студэнтамі выступілі рэктар Вячаслаў Шаршуноў, старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Дуктаў, а таксама многія паэты і празаікі, творы якіх змешчаны ў кнізе: гучалі вершы і песні на словы аўтараў выдання.

**Уладзімір САСНОЎКІН**